International
Accountability
Platform
for Belarus

# Сёмая справаздача аб ходзе работы



Для шырокай
аўдыторыі

**Пра Міжнародную платформу па прыцягненню вінаватых да адказнасці для Беларусі** 3

**КАРОТКІ ЗМЕСТ** 5

A. Сітуацыя ў краіне 7

B. Выкананне асноўных мэтаў 9

a. Мэты і аб'ём працы 9

b. Збор інфармацыі ад пацярпелых і іншых сведак 10

c. Дапамога органам па прыцягненню да адказнасці 10

***i. Група незалежных экспертаў (ГНЭБ)*** ***10***

***ii. Органы крымінальнага правасуддзя*** ***11***

***iii. Няўрадавыя арганізацыі і адвакаты*** ***11***

d. Праца Платформы над падрыхтоўкай спраў 11

***i. Збор доказаў*** ***12***

***ii. Аналітычныя прадукты*** ***12***

***iii. Краінавыя рабочыя групы*** ***13***

❑ Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу 13

f. Садзейнічанне доступу да паслуг у галіне аховы псіхічнага здароўя і псіхалагічнай падтрымкі 14

g. Інфраструктура Платформы 15

h. Фінансаванне 16

i. Актуальныя цяжкасці 16

j. Планаванне на будучыню 17

*Падзяка* 18

ЗАЎВАГІ 19

## Пра Міжнародную платформу па прыцягненню вінаватых да адказнасці для Беларусі

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (IAPB) [тут і далей — "Платформа"] — гэта кааліцыя незалежных няўрадавых арганізацый, якія аб'яднаlі намаганні для збору, кансалідацыі, праверкі і захавання доказаў грубых парушэнняў правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі паводле класіфікацыі міжнароднага права, меркавана учыненых беларускімі ўладамі і іншымі асобамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і пасля іх. З гэтай мэтай, Платформа абапіраецца на бягучую працу беларускіх праваабарончых арганізацый па зборы інфармацыі аб парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у Беларусі. Інфармацыя і доказы, сабраныя платформай, будуць садзейнічаць незалежным і справядлівым крымінальным расследаванням і пераследу, што праводзяцца ў адпаведнасці з міжнародным правам і стандартамі, у нацыянальных або міжнародных судах або трыбуналах, якія маюць або могуць мець юрысдыкцыю ў дачыненні да гэтых злачынстваў. Інфармацыя і доказы таксама паслужаць падтрымкай іншым механізмам, накіраваным на забеспячэнне адказнасці за злачынствы па міжнародным праве, меркавана здзейсненым у Беларусі, у тым ліку Экспертызе УВКПЧ ААН па сітуацыі ў Беларусі. Платформа складаецца з Кіруючага камітэта, які адказвае за кіраўніцтва працай Платформы, Сакратарыята і Кансультатыўнай рады. У склад Кіруючага камітэта ўваходзяць DIGNITY — Дацкі інстытут супраць катаванняў (старшыня Платформы), Праваабарончы цэнтр "Вясна" (сустаршыня), Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі (сустаршыня) і арганізацыя REDRESS (сустаршыня). Акрамя шэрагу беларускіх арганізацый, якія не пажадалі быць публічна названымі па меркаваннях бяспекі, у склад Кансультатыўнай рады ўваходзяць наступныя арганізацыі: Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (ECCHR), Міжнародная федэрацыя па правах чалавека (FIDH), Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў (IRCT), Нарвежскі Хельсінкскі камітэт (NHC), міжнародная арганізацыя "Лекары за правы чалавека" (PHR), міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры без межаў" (RSF) і Сусветная арганізацыя супраць катаванняў (OMCT). Праца Платформы вядзецца Сакратарыятам, які складаецца з юрыстаў і медыкаў, якія валодаюць ведамі і вопытам у галіне міжнародных крымінальных расследаванняў і судовых разбіральніцтваў. Платформа была створана 24 сакавіка 2021 года ў адказ на справаздачу дакладчыка Маскоўскага механізма Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) Пастаяннай радзе АБСЕ 5 лістапада 2020 года. Сярод іншага, справаздача заклікае дзяржавы прыцягнуць да адказнасці асоб, вінаватых у катаваннях і бесчалавечным абыходжанні, у тым ліку сэксуальным гвалце і іншых грубых парушэннях правоў чалавека, здзейсненых у сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі 9 жніўня 2020

года. Платформа карыстаецца падтрымкай шырокага кола дзяржаў, у прыватнасці Аўстрыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Ірландыі, Ісландыі, Канады, Латвіі, Літвы, Ліхтэнштэйна, Нарвегіі, Нідэрландаў, Польшчы, Румыніі, Славакіі, Фінляндыі, Чэхіі, Швейцарыі і Эстоніі, а таксама Еўрапейскага Саюза.

## КАРОТКІ ЗМЕСТ

Дакументаванне меркаваных злачынстваў па міжнароднаму праву кансорцыумам незалежных арганізацый грамадзянскай супольнасці, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага крымінальнага права і прынятымі прававымі стандартамі, стварае значны прэцэдэнт у справе прыцягнення да адказнасці асоб, вінаватых у гэтых злачынствах. Больш ранія ініцыятывы па прыцягненні да адказнасці ў асноўным адпавялалі праваабарончым стандартам дакументавання, што важна для ўстанаўлення адказнасці дзяржавы за парушэнні правоў чалавека. Аднак у рамках такіх ініцыятыў часта адсутнічае важная інфармацыя аб меркаваных злачынцах і ланцужках камандавання, а пры зборы доказаў не ў поўнай меры выконваюцца прававыя стандарты допушчальнасці ў рамках крымінальнай судовай вытворчасці. У гэтым адрозненне Платформы як механізму грамадзянскай супольнасці, закліканага дакументаваць грубыя парушэнні правоў чалавека, якія з'яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, і дапамагаць органам крымінальнага правасуддзя ў расследаванні і пераследзе меркаваных вінаватых у здзяйсненні міжнародных злачынстваў.

Платформа дае інфармацыю па запыце дзяржаў, супрацоўнічае з групай незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (ГНЭБ), з дакладчыкам Маскоўскага механізму АБСЕ, з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і адвакатамі, якія працуюць па Беларусі, а таксама актыўна садзейнічае працы па прыцягненні да адказнасці ў рамках нацыянальных, рэгіянальных і міжнародных судоў, трыбуналаў і органаў па правах чалавека.

## Сітуацыя ў краіне

Узровень рэпрэсій у Беларусі супраць палітычнай апазіцыі, грамадзянскай супольнасці і тых, хто выказвае іншадумства, застаецца высокім. Па стане на 29 верасня 2024 года ў месцах пазбаўлення волі заставаліся 1325 палітычных вязняў, у тым ліку вядомыя беларускія праваабаронцы. Некалькі вядомых палітычных зняволеных па-ранейшаму ўтрымліваюцца ва ўмовах інкамунікада, у штрафных ізалятарах, адзіночных камерах і пазбаўленыя доступу да медыцынскай дапамогі. Артыкул 411 (*"Непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы"*) Крымінальнага кодэкса Беларусі ўжываўся для адвольнага падаўжэння тэрміну заключэння палітычных вязняў. У сваёй рэзалюцыі аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных, прынятай 19 верасня 2024 года, Еўрапейскі парламент выказаў занепакоенасць з нагоды 300 000 беларусаў, якія пасля 2020 года былі вымушаныя пакінуць Беларусь і падвяргаюцца палітычнаму пераследу і за мяжой.

Па стане на 9 верасня 2024 года 4 396 чалавек былі ўключаны ў Спіс арганізацый і асоб, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці, акрамя таго, у справаздачны перыяд праводзіліся завочныя судовыя працэсы ў дачыненні да асоб, якія пакінулі Беларусь. 7 кастрычніка 2024 года Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, які з'яўляецца арганізацыяй-сузаснавальнікам Платформы, быў унесены ў спіс экстрэмісцкіх фарміраванняў.

30 верасня 2024 года ўрад Літвы звярнуўся ў Міжнародны крымінальны суд (МКС) з просьбай разгледзець пытанне аб наяўнасці ў МКС юрысдыкцыі для расследавання і судовага пераследу меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці, у тым

ліку дэпартацыі, пераследу і іншых бесчалавечных дзеянняў, учыненых беларускімі афіцыйнымі асобамі з 1 мая 2020 года.

## Ключавыя дасягненні

За справаздачны перыяд Платформа сабрала інфармацыю і сведчанні 105 пацярпелых і сведак (46 жанчын, 59 мужчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, у выніку чаго агульная колькасць праведзеных інтэрв'ю дасягнула 2 637 (з іх 1 677, у тым ліку 394 жанчыны, 1 283 мужчыны ўжо былі прамаркіраваныя на прадмет гендэрнай праблематыкі), а колькасць дакументаў у калекцыі закрытых крыніц Платформы павялічылася да 29 492. Да 30 верасня 2024 года былі апрацаваныя 18 222 файлаў, а з адкрытых крыніц было сабрана больш за 1 223 315 матэрыялаў, у тым ліку 197 271 відэа, 560 242 выявы і 465 830 тэкставых матэрыялаў.
З моманту свайго стварэння Платформа атрымала 8 запытаў аб дапамозе ад 5 дзяржаў, 4 запыты на інфармацыю ад Экспертызы УВКПЧ ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, а з красавіка 2024 года – ад Групы незалежных экспертаў ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі (ГНЭБ), адзін запыт ад дакладчыка Маскоўскага механізму АБСЕ, а таксама некалькі запытаў ад арганізацый грамадзянскай супольнасці і юрыстаў, якія працуюць па Беларусі. У адказ Платформа падала аналітычныя справаздачы, статыстычныя дадзеныя аб доказах, кантактныя дадзеныя сведак і іншую карысную інфармацыю.

Беларускія партнёры прайшлі навучанне правядзенню інтэрв'ю, заснаванае на падыходзе, арыентаваным на пацярпелых, імкнучыся стварыць -- наколькі гэта магчыма ў дадзеных абставінах -- бяспечнае асяроддзе, тлумачачы мэту і працэс, даючы магчымасць пацярпелым задаваць пытанні і выкарыстоўваючы адкрытыя пытанні ў абстаноўцы, дзе выяўляецца эмпатыя, цярпенне і актыўнае слуханне.

Больш за тое, з красавіка 2024 года 81 чалавек (41 жанчына і 40 мужчын) скарысталіся паслугамі ПЗСПП, у выніку чаго агульная колькасць чалавек, якія атрымалі дапамогу з пачатку фазы I дасягнула 564 чалавек. Платформа стварыла шырокі спектр каналаў накіравання да розных правераных, навукова абгрунтаваных метадаў дапамогі, якія прадастаўляюцца медыцынскімі спецыялістамі і медыцынскімі цэнтрамі, а таксама да юрыдычнай падтрымкі, пастаянна працуючы над удасканаленнем гэтага працэсу, каб зрабіць яго больш даступным для пацярпелых.

## Дапамога органам па прыцягненню да адказнасці

За справаздачны перыяд Платформа атрымала яшчэ тры запыты аб дапамозе ад дзяржаўных органаў, правяла дадатковыя сустрэчы з трэцім дзяржаўным органам, вядучым расследаванне, адказала на запыт няўрадавай арганізацыі і ўстанавіла кантакт з нядаўна створанай Групай незалежных экспертаў ААН (ГНЭБ).

## Праца Платформы над падрыхтоўкай спраў

У справаздачны перыяд Платформа займалася аналізам перыяду з мая па верасень 2020 года і далейшым удасканаленнем стандартаў збору доказаў і аналітычнай працы, уключаючы трэнінгі па кожным асноватворным дзеянні ў злачынствах супраць чалавечнасці, у тым ліку па канкрэтных сцэнарах інтэрв'ю і прававой базе, а таксама па злачынствах дэпартацыі і злачынствах на сэксуальнай і гендэрнай глебе (СГЗ). Сакратарыят Платформы падтрымлівае цесныя працоўныя стасункі з дакументатарамі арганізацый-сузаснавальнікаў і прымае актыўны ўдзел у сустрэчах і кансультацыях, якія праводзяцца раз на два тыдні.

## А. Сітуацыя ў краіне

Узровень рэпрэсій у Беларусі супраць палітычнай апазіцыі, грамадзянскай супольнасці і тых, хто выказвае іншадумства, застаецца высокім. Праваабарончыя арганізацыі паведамляюць, што ў краіне па-ранейшаму шырока распаўсюджаныя адвольныя затрыманні, катаванні і іншыя формы жорсткага абыходжання пры затрыманні і ў зняволенні, палітычна матываваныя абвінавачванні, парушэнні гарантый справядлівага судовага разбіральніцтва падчас адміністрацыйных і крымінальных працэсаў, а таксама злоўжыванні пры прымяненні празмерна расплывістых законаў аб барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам. Усяго па стане на 9 верасня 2024 года ў "Пераліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэміскай дзейнасці" знаходзіцца 4 396 фізічных асоб.[1]

Па стане на 29 верасня 2024 года ў зняволенні заставалася 1325 палітычных вязняў,[2] у тым ліку вядомыя беларускія праваабаронцы Алесь Бяляцкі,[3] Валянцін Стэфановіч, Уладзімір Лабковіч, Марыя Рабкова, Андрэй Чапюк і Наста Лойка.[4] Паводле звестак Беларускай асацыяцыі журналістаў, на жнівень 2024 года ў Беларусі ў зняволенні застаюцца 37 журналістаў і супрацоўнікаў СМІ.[5] З ліпеня па верасень 2024 года Аляксандр Лукашэнка памілаваў 115 палітвязняў, асуджаных за злачынствы, звязаныя з іх пратэснай дзейнасцю.[6] У той жа час беларускія праваабарончыя арганізацыі зафіксавалі 142 выпадкі затрымання новых палітычных вязняў.

Некалькі вядомых палітычных зняволеных па-ранейшаму ўтрымліваюцца пад вартай у рэжыме інкамунікада без магчымасці кантакту з сям'ёй або адвакатам,[7] у тым ліку Максім Знак, Марыя Калеснікава, Мікалай Статкевіч і Ігар Лосік, пазбаўленыя сувязі са знешнім светам з лютага 2023 года.[8] Апошні кантакт з Сяргеем Ціханоўскім адбыўся ў сакавіку 2023 года, з Віктарам Бабарыкам -- у красавіку 2023 года, а з Палінай Шарэндай-Панасюк -- у студзені 2024 года.[9]

Беларускія ўлады працягваюць змяшчаць асуджаных па палітычных матывах у штрафныя ізалятары, адзіночнае заключэнне[10] і пазбаўляць іх доступу да належнай медыцынскай дапамогі.[11]

Больш за тое, артыкул 411 (*"Непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы"*) Крымінальнага кодэкса Беларусі актыўна ўжываецца для адвольнага падаўжэння тэрміну заключэння палітычных вязняў.[12] Па стане на жнівень 2024 года былі распачатыя новыя крымінальныя справы па артыкуле 411 у дачыненні да 47 палітвязняў,[13] а прысуды па гэтым артыкуле вынесеныя як мінімум пяці зняволеным.[14]

Паведамлялася аб актах пераследу і ў дачыненні да членаў сем'яў палітвязняў,[15] у тым ліку па меншай меры 129 чалавек былі прыцягнутыя

да адміністрацыйнай адказнасці за атрыманне гуманітарнай дапамогі ў рамках грамадскай ініцыятывы INeedHelpBY са студзеня па жнівень 2024 года (з 129 чалавек 6 былі судзімыя з красавіка па верасень 2024 года).[16] Яшчэ больш за 20 чалавек знаходзіліся пад вартай па крымінальных абвінавачваннях у аказанні дапамогі палітычным зняволеным, з якіх па меншай меры чатыры чалавекі ўжо былі прысуджаныя да турэмнага зняволення.[17]

З красавіка па жнівень 2024 года Камітэт дзяржаўнай бяспекі і Міністэрства ўнутраных спраў абвясцілі экстрэмісцкімі арганізацыямі не менш за 38 арганізацый,[18] у тым ліку Асацыяцыю палітвязняў Беларусі і "Deutsche Welle".[19] 7 кастрычніка 2024 года Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, які з'яўляецца арганізацыяй-сузаснавальнікам Платформы, быў унесены ў спіс экстрэмісцкіх фармаванняў.[20] У перыяд з лютага па верасень 2024 года па меншай меры 70 чалавек былі дададзеныя ў пералік арганізацый і прыватных асоб, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці.[21]

На працягу справаздачнага перыяду таксама працягваліся завочныя судовыя працэсы над тымі, хто пакінуў Беларусь. З красавіка па верасень 2024 года прынамсі 52 чалавекі былі асуджаныя завочна па палітычна матываваных абвінавачваннях, пераважная большасць з іх атрымалі вырак у выглядзе турэмнага зняволення.[22] У іх кола ўваходзяць 20 чалавек, якія кансультавалі або працавалі са Святланай Ціханоўскай,[23] а таксама праваабаронца Леанід Судаленка.[24] У жніўні 2024 года Гродзенскі абласны суд завочна прызнаў журналіста і праваабаронцу Уладзіміра Хільмановіча вінаватым у трох злачынствах, звязаных з экстрэмізмам.[25]

Асуджаны да смяротнага пакарання ў чэрвені 2024 года па шасці абвінавачваннях,[26] у тым ліку за "акт тэрарызму", супрацоўнік Нямецкага Чырвонага Крыжа Рыка Крыгер праз месяц быў памілаваны Аляксандрам Лукашэнкам і вернуты ў Германію ў рамках абмену палітвязнямі паміж Германіяй, Злучанымі Штатамі Амерыкі і Расейскай Федэрацыяй.[27]

Таксама паступаюць паведамленні аб тым, што беларускія зняволеныя выкарыстоўваюцца прыватнымі кампаніямі ў якасці таннай працоўнай сілы.[28]

У выніку расследавання, праведзенага польскімі і літоўскімі ўладамі, 6 верасня 2024 года тром грамадзянам Беларусі былі прад'яўленыя абвінавачванні ў прымусовай пасадцы самалёта авіякампаніі Ryanair для затрымання Рамана Пратасевіча, адміністратара Telegram-канала @nexta_live, і яго партнёркі. Неназваным падазраваным былі прад'яўленыя абвінавачванні ў незаконным пазбаўленні волі 132 чалавек шляхам здзяйснення тэрарыстычных актаў і ў намеры сур'ёзнага запалохвання вялікай колькасці людзей, у тым ліку груп, якія выступаюць супраць беларускага рэжыму.[29]

На працягу справаздачнага перыяду выкананне Беларуссю міжнародных абавязацельстваў у галіне правоў чалавека разглядалася Камітэтам ААН супраць катаванняў, Камітэтам ААН па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі і Камітэтам ААН па правах інвалідаў.[30] У сваім дакладзе ад 21 чэрвеня 2024 года Камітэт ААН супраць катаванняў прыйшоў да высновы, што "катаванні з'яўляюцца сістэматычнай практыкай у Беларусі" па шэрагу прычын: адмова супрацоўнікаў праваахоўных органаў і пракуратуры прымаць меры па скаргах на катаванні, праводзіць эфектыўныя, аператыўныя і бесстаронніх расследаванні па скаргах на катаванні або жорсткае абыходжанне, а таксама прыцягваць вінаватых да адказнасці. Камітэт супраць катаванняў таксама адзначыў неэфектыўнасць механізмаў падачы скаргаў і адсутнасць незалежнага механізму маніторынгу месцаў пазбаўлення волі.[31] Камітэт ААН па ліквідацыі расавай дыскрымінацыі адзначыў сваю занепакоенасць адміністрацыйнымі і іншымі абмежаваннямі, з якімі сутыкаюцца прадстаўнікі нацыянальных і іншых меншасцяў у дачыненні да шэрагу правоў.[32]

19 верасня 2024 года Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных.[33] Сярод іншага, ён выказаў занепакоенасць пераследам у выгнанні, напрыклад, злоўжываннем ордэрамі на арышт Інтэрпола для экстрадыцыі палітычных апанентаў з краін, якія не ўваходзяць у ЕС; заклікаў Сербію ўстрымацца ад экстрадыцыі беларускага журналіста Андрэя Гнёта;[34] а таксама выказаў трывогу з нагоды 300 000 беларусаў, якія былі вымушаныя пакінуць Беларусь з 2020 года і сутыкаюцца з палітычным пераследам за мяжой.[35]

30 верасня 2024 года ўрад Літвы накіраваў у Міжнародны крымінальны суд (МКС) зварот з нагоды сітуацыі ў Беларусі -- дзяржаве, якая не з'яўляецца чальцом МКС.[36] У сваім звароце ўрад Літвы просіць Міжнародны крымінальны суд вывучыць, ці валодае ён юрысдыкцыяй на расследванне і судовы пераслед злачынстваў супраць чалавечнасці, у тым ліку дэпартацыі, пераследа і іншых бесчалавечных актаў, здзейсненых высокапастаўленымі службовымі асобамі Беларусі з 1 траўня 2020 года.[37] Абапіраючыся на папярэдняе рашэнне МКС прызнаць юрысдыкцыю ў дачыненні да дзяржавы, якая не з'яўляецца членам МКС, у кантэксце дэпартацыі (сітуацыя ў М'янме/Бангладэшы), Літва заявіла, што, раз частка злачынстваў адбылася на яе тэрыторыі і тэрыторыі іншых дзяржаў-членаў МКС, то такія справы падпадаюць пад яго юрысдыкцыю. Платформа апублікавала прэс-рэліз, у якім вітала перадачу справы ў суд, але адзначыла, што гэтая перадача, калі яна будзе прынятая, ахопіць толькі некаторыя злачынствы, здзейсненыя ў Беларусі.[38]

## B. Выкананне асноўных мэтаў

### a. Мэты і аб'ём працы

- **Стратэгічная мэта 1:** Умацаванне доказнай базы Платформы шляхам далейшага пашырэння крыніц доказаў, цэнтралізаванага захавання інфармацыі і доказаў, а таксама аналізу злачынстваў па міжнародным праве, здзейсненых у Беларусі ў кантэксце выбараў у жніўні 2020 года і іх наступстваў.
- **Стратэгічная мэта 2:** пашырэнне спектру доказных і аналітычных прадуктаў, а таксама працэсаў па прыцягненні да адказнасці і іншых суб'ектаў, дзейнасці якіх будуць эфектыўна служыць прадукты працы Платформы (у тым ліку Экспертыза УВКПЧ, іншыя праваабарончыя механізмы і органы, а таксама органы крымінальнага правасуддзя).
- **Стратэгічная мэта 3:** Укараненне падыходу, арыентаванага на пацярпелых, што ўлічвае іх траўмы, ва ўсе аспекты працы Платформы.
- **Стратэгічная мэта 4:** Забеспячэнне стварэння пастаяннай інфраструктуры і ўстойлівасці дзейнасці Платформы.

## b. Збор інфармацыі ад пацярпелых і іншых сведак

За справаздачны перыяд Платформа сабрала інфармацыю і сведчанні 105 пацярпелых і сведак (46 жанчын, 59 мужчын) аб меркаваных злачынствах па міжнародным праве, у выніку чаго агульная колькасць праведзеных інтэрв'ю дасягнула 2 637, а колькасць дакументаў у калекцыі закрытых крыніц Платформы павялічылася да 29 492. Сабраныя інтэрв'ю ўтрымліваюць інфармацыю аб затрыманнях і ўтрыманні пад вартай, абыходжанні са зняволенымі і актах запалохвання з боку дзяржаўных органаў.

Платформа працягвае збіраць паўторную інфармаваную згоду ў пацярпелых і іншых сведак, каб забяспечыць актуальнасць гэтай згоды на момант перадачы любой інфармацыі і патэнцыйных доказаў, прадстаўленых імі, трэцім бакам. На 20 верасня 2024 года больш за 800 сведак падпісалі новую форму згоды. На 30 верасня 2024 года каманда двухмоўных (руская-англельская) рэцэнзентаў праверыла і прамаркіравала 18 222 файлы.

Платформа таксама сабрала больш за 1 223 315 матэрыялаў з адкрытых крыніц, у тым ліку 197 271 відэа, 560 242 выявы і 465 830 тэкставых матэрыялаў з больш чым 800 крыніц. Відэазапісы з аўдыядарожкай былі апрацаваны з дапамогай праграм аўтаматычнага распазнавання маўлення, што дало магчымасць атрымаць 161 330 расшыфровак, якія цяпер дазваляюць ажыццяўляць комплексны тэкставы пошук. Інфармацыя і матэрыялы з адкрытых крыніц служаць асновай для аналітычнай працы Платформы, дазваляючы атрымаць каштоўную інфармацыю як аб асобных інцыдэнтах, так і аб больш шырокім кантэксце.

## c. Дапамога органам па прыцягненню да адказнасці

### i. Група незалежных экспертаў (ГНЭБ)

Нядаўна створаная Група незалежных экспертаў ААН (ГНЭБ) звярнулася да платформы з просьбай прадставіць адпаведную інфармацыю і дакументы, звязаныя з яе мандатам, да 30 лістапада 2024 года. Ужо ў жніўні Платформа наладзіла кантакт з ГНЭБ[39] і яе супрацоўнікамі, якія працягваюць працу, распачатую раней у рамках Экспертызы УВКПЧ па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Раней Платформа прадставіла доказы і аказала садзейнічанне Экспертызе УВКПЧ у арганізацыі інтэрв'ю.

### ii. Органы крымінальнага правасуддзя

За справаздачны перыяд Платформа атрымала яшчэ тры запыты аб дапамозе ад дзяржаўных органаў і запыт на дадатковую інфармацыю ад аднаго органа. Былі праведзены сустрэчы з кожным органам, які зрабіў запыт, і на дадзены момант праводзіцца аналіз адпаведных матэрыялаў з закрытых і адкрытых крыніц з мэтай прадстаўлення адпаведных дакладаў у бліжэйшыя месяцы.

У рамках падтрымкі нацыянальных органаў пракуратуры ў цяперашні час Платформа распрацоўвае два аналітычныя матэрыялы, якія будуць перададзены органам пракуратуры, якія ўжо атрымалі інфармацыю ад Платформы, а таксама любым органам, якія могуць запрасіць інфармацыю ў будучыні:

(i) Матэрыял пра гендарныя нормы ў Беларусі і іх значэнне з пункту гледжання здзяйснення гендарнага гвалту, як да, так і падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года; і
(ii) Матэрыял пра перашкоды для раскрыцця інфармацыі пра гендарны гвалт пацярпелымі/сведкамі ў беларускім кантэксце.

Гэтыя аналітычныя матэрыялы прызначаны для інфармавання органаў крымінальнага правасуддзя і іншых органаў па прыцягненні да адказнасці і аказання ім дапамогі ва ўжыванні гендарнага падыходу пры расследаванні, аналізе і судовым пераследзе міжнародных злачынстваў, здзейсненых у Беларусі.

### iii. Няўрадавыя арганізацыі і адвакаты

У маі 2024 года Платформа адказала на запыт аб прадастаўленні інфармацыі, накіраваны няўрадавай арганізацыяй, якая займаецца пытаннямі прыцягнення да адказнасці за злачынствы па міжнародным праве, здзейсненыя ў Беларусі. Запыт датычыўся статыстычных дадзеных аб наяўных доказах у дачыненні да канкрэтнага злачынства і быў належным чынам выкананы.

## d. Праца Платформы над падрыхтоўкай спраў

Акрамя рэагавання на канкрэтныя запыты, Платформа вызначыла асноўныя кірункі дзейнасці, закліканыя палепшыць працу над падрыхтоўкай спраў у будучыні. У цяперашні час дзейнасць Платформы сканцэнтравана на далейшым удасканаленні стандартаў збору доказаў і развіцці аналітычнай працы з улікам вопыту, атрыманага ў ходзе дыялогу з пракурорамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці.

### i. Збор доказаў

З самага пачатку асноўнай задачай Платформы і яе сузаснавальнікаў было забеспячэнне збору доказаў у адпаведнасці з самымі высокімі стандартамі крымінальнага правасуддзя. У гэтым напрамку за справаздачны перыяд была праведзена наступная праца:

- Навучанне па кожным з асноватворных дзеянняў, звязаных са злачынствамі супраць чалавечнасці, што ўключае як прававую базу, так і канкрэтныя сцэнары/гульнявыя сітуацыі інтэрв'ю, заснаваныя на папярэдняй практыцы.
- Больш падрабязныя вочныя трэнінгі, прысвечаныя двум ключавым злачынствам, якімі займаецца Платформа ў гэтым годзе -- дэпартацыі і злачынствам на сэксуальнай і гендэрнай глебе.
- Зваротная сувязь паміж Платформай і партнёрскімі арганізацыямі па інтэрв'ю, якія праводзіліся ў 2024 годзе, для выяўлення абласцей, якія патрабуюць паляпшэння, і ўнясення неабходных зменаў.

### ii. Аналітычныя прадукты

Аналітычныя прадукты Платформы рыхтуюцца на канфідэнцыйнай аснове для нацыянальных і міжнародных органаў пераследу. Канфідэнцыйны статус гэтых дакументаў вельмі важны на этапе падрыхтоўкі справы, паколькі ён абараняе канфідэнцыйную інфармацыю, забяспечвае цэласнасць расследаванняў і прадухіляе любыя патэнцыйныя перашкоды, якія могуць паўстаць у выніку апублікавання інфармацыі. У будучыні Платформа сумесна са сваімі партнёрскімі арганізацыямі будзе працаваць і над падрыхтоўкай публічных версій гэтых дакументаў для выкарыстання іншымі арганізацыямі ў мэтах забеспячэння адказнасці, а таксама ў якасці ўнёску ў захаванне спадчыны.

Цяпер Платформа займаецца аналізам "асноўнага" перыяду гвалту да і пасля выбараў 2020 года, г.зн. з мая па верасень 2020 года (на гэты перыяд таксама была накіравана большасць запытаў на сённяшні дзень).  У гэты справаздачны перыяд праца вялася па наступных напрамках:

- ***Рэзюмэ паказанняў сведак*** Нацыянальныя пракуратуры рэгулярна запрошваюць кароткія рэзюмэ сведчанняў сведак, каб хутка і лёгка азнаёміцца з наяўнымі доказамі. Аналітыкі Платформы рыхтуюць кароткія рэзюмэ паказанняў усіх апытаных за гэты перыяд часу. Рэзюмэ ўяўляюць сабой факталагічныя дадзеныя, але таксама

прапануюць папярэднюю прававую характарыстыку падзей і паслужаць важнай "дарожнай мапай" для падрыхтоўкі судовых спраў.

- ***Аналіз "датычнасці".*** Многія нацыянальныя следчыя органы і органы пракуратуры запрошваюць інфармацыю аб патэнцыйных злачынцах. Платформа распрацавала комплексны агляд дзяржаўных структур *дэ-юрэ*, у тым ліку па сілавых структурах, абапіраючыся на інфармацыю з адкрытых крыніц.
- ***Асноўны "бягучы даклад" аб кантэкстуальных элементах і асноватворных дзеяннях.*** Пракуроры рэгулярна запрошвалі інфармацыю аб "агульнай карціне", што тычыцца кантэкстуальных элементаў злачынстваў супраць чалавечнасці і магчымых асноватворных дзеянняў у Беларусі, а таксама больш канкрэтную інфармацыю аб асобных пацярпелых.
- ***Мэтавая маркіроўка на платформе для закрытых крыніц.*** Каманда Платформы выкарыстоўвае досвед, атрыманы ў ходзе работы па складанні рэзюмэ сведак, для ўдасканалення маркіроўкі паказанняў сведак, а таксама дадзеных з адкрытых крыніц. Усе матэрыялы, прадастаўленыя сведкамі, маркіруюцца для палягчэння наступнага пошуку, у тым ліку такія дэталі, як асабістая інфармацыя апытанага, месца яго затрымання і ўтрымання пад вартай, дзяржаўныя служачыя, з якімі ён сутыкаўся, віды дзеянняў, якім ён падвяргаўся, а таксама дакументы, якія ён перадаў, напрыклад, судовыя пратаколы.

### iii. Краінавыя рабочыя групы

У верасні 2024 года, у Вільні, Платформа арганізавала круглы стол па пытаннях універсальнай юрысдыкцыі. Круглы стол сабраў прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і юрыстаў для абмеркавання прававых і інстытуцыйных асноў універсальнай юрысдыкцыі ў Літве, бягучага вопыту супрацоўніцтва паміж НДА і ўладамі, а таксама існуючай падтрымкі пацярпелых. Ён быў арганізаваны ў рамках падрыхтоўкі да сустрэчы рабочай групы, якая адбудзецца ў канцы гэтага года.

## ☐ Абмен ведамі і нарошчванне патэнцыялу

Сакратарыят Платформы падтрымлівае цесныя працоўныя стасункі з дакументатарамі арганізацый-сузаснавальнікаў і прымае актыўны ўдзел у сустрэчах і кансультацыях, якія праводзяцца раз на два тыдні. Такая унікальная структура спрыяе абмену ведамі па актуальных пытаннях, у тым ліку па такіх як медыцынскае дакументаванне, агульныя метады правядзення інтэрв'ю і тэхнікі інтэрв'юіравання для збору доказаў аб незаконным затрыманні, катаваннях, гендарным гвалце і дэпартацыі.

Платформа карыстаецца з сінэргіі, створанай праектам "Барацьба з беспакаранасцю ў Беларусі", што рэалізуецца ў цесным супрацоўніцтве з Сакратарыятам Платформы.[40] Гэта асобны, але камплiментарны працы Платформы праект, накіраваны на ўмацаванне патэнцыялу ключавых удзельнікаў,[41] у тым ліку мясцовых партнёрскіх арганізацый і

прадстаўнікоў адпаведных нацыянальных і міжнародных органаў улады, для забеспячэння правасуддзя і прыцягнення да адказнасці за злачынствы, здзейсненыя беларускімі ўладамі.

## f. Садзейнічанне доступу да паслуг у галіне аховы псіхічнага здароўя і псіхалагічнай падтрымкі

Беларускія партнёры прайшлі навучанне правядзенню інтэрв'ю, кіруючыся падыходам, арыентаваным на пацярпелых, імкнучыся стварыць -- наколькі гэта магчыма ў дадзеных абставінах -- бяспечную абстаноўку, у якой пацярпелыя адчувалі б сябе абароненымі і адчувалі павагу. Інтэрв'юеры тлумачаць мэты і працэс, даюць пацярпелым магчымасць задаваць пытанні і выкарыстоўваюць адкрытыя пытанні, якія заахвочваюць пацярпелых распавесці аб сваім досведзе сваімі словамі. Іх вучаць актыўна слухаць, праяўляць эмпатыю на працягу ўсяго інтэрв'ю, рабіць паўзы і ўважліва ставіцца да самаадчування апытанага, у прыватнасці да прыкметаў траўматычнай рэакцыі.

Атрыманне інфармаванай згоды ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі GDPR і з захаваннем працэдур інфармаванай згоды. Больш за тое, Платформа імкнецца рэгулярна абнаўляць першапачатковыя формы згоды, каб забяспечыць іх актуальнасць.

Камандам дакументатараў і супрацоўнікам Сакратарыята таксама было рэкамендавана прайсці электронны курс АБСЕ/БДІПЧ па правядзенні інтэрв'ю[42] з улікам траўмы, распрацаваны Дэпартаментам па правах чалавека БДІПЧ, які спрыяе развіццю навыкаў і ведаў у галіне тэхнікі правядзення інтэрв'ю і практычнага прымянення прынцыпу "не нашкодзь".

Акрамя таго, Платформа прадастаўляе пацярпелым навукова абгрунтаваную дапамогу ў галіне псіхічнага здароўя і псіхасацыяльнай падтрымкі (ПЗПСП), арыентаваную на пацярпелых з улікам іх траўмы. Яна старанна працуе над стварэннем сістэмы перанакіравання на атрыманне ПЗПСП і комплекснай сістэмы клінічнага маніторынгу і ацэнкі, якая ўключае маніторынг стрэсу, дэпрэсіі, сну і агульнага самаадчування.

Патрэбы пацярпелых моцна адрозніваюцца, і часта адна арганізацыя не ў стане задаволіць усе патрэбы ў падтрымцы, асабліва ў выпадках масавых парушэнняў. Таму стварэнне надзейных каналаў перанакіравання да спецыялістаў для забеспячэння доступу да спецыялізаваных сістэмаў падтрымкі мае вырашальнае значэнне. Эфектыўныя сістэмы перанакіравання таксама пашыраюць магчымасці арганізацый па ўзаемадзеянні з больш шырокімі супольнасцямі пацярпелых, якія ўжо могуць быць у кантакце з канкрэтнымі спецыялістамі ў гэтай галіне. Неад'емнай часткай падыходу, арыентаванага на пацярпелых, з'яўляецца накіраванне пацярпелых у службы, якія прадстаўляюць медыцынскую, сацыяльную, псіхасацыяльную і юрыдычную падтрымку, а таксама

прытулак. Накіраванне павінна быць аператыўным і, па магчымасці, простым, каб пазбегнуць сітуацыі, калі пацярпелага перакідваюць з адной арганізацыі ў іншую.

З красавіка 2024 года паслугамі ПЗПСП скарыстаўся 81 чалавек (41 жанчына і 40 мужчын) , у выніку чаго агульная колькасць чалавек, якія атрымалі дапамогу з пачатку фазы ▯дасягнула 564. Платформа стварыла шырокі спектр каналаў накіравання да розных правераных, навукова абгрунтаваных метадаў дапамогі, якія прадастаўляюцца медыцынскімі спецыялістамі і медыцынскімі цэнтрамі, а таксама да юрыдычнай падтрымкі, пастаянна працуючы над удасканаленнем гэтага працэсу, каб зрабіць яго больш даступным для пацярпелых.

Платформа пашырыла геаграфічную зону і павялічыла колькасць спецыялістаў і медыцынскіх цэнтраў у розных краінах, каб палепшыць доступ да гэтых паслуг. Платформа выяўляе ініцыятывы і арганізацыі, якія прадстаўляюць паслугі, што адпавядаюць неабходным патрабаванням, і цесна супрацоўнічае са спецыялістамі ў галіне ПЗПСП, абмяркоўваючы з імі працэс накіравання да спецыялістаў і рэгулярна аналізуючы дадзеныя аб перанакіраваннях для паляпшэння гэтага працэсу.

У маі 2024 года ў Вільні быў праведзены вочны семінар, падчас якога Платформа арганізавала навучанне і ментарства арганізацый-сузаснавальнікаў па пытаннях даследаванняў і адвакацыі, арыентаваных на пацярпелых, і формах уцягвання пацярпелых у такую дзейнасць.

Акрамя таго, Платформа надае асаблівую ўвагу арганізацыі доступу ўласных каманд да ПЗПСП і актыўна пашырае магчымасці ўсіх удзельнікаў па пераадоленні другаснай траўмы і стрэсу. Акрамя таго, для ўсіх членаў каманды арганізаваныя зразумелыя схемы накіравання на атрыманне ПЗПСП, якія прадстаўляюцца спецыялістамі на рускай, беларускай і ангельскай мовах.

## g. Інфраструктура Платформы

Каманда Сакратарыята Платформы складаецца з некалькіх чалавек, у тым ліку кіраўніка, мэнэджэра праекта, праектнага спецыяліста, старэйшага юрысконсульта, старэйшага аналітыка, даследчыка па адкрытых крыніцах, мэнэджара сістэм дадзеных, малодшых аналітыкаў і рэцэнзентаў дадзеных. З 15 жніўня 2024 г. новым кіраўніком Платформы стала Андрэа Хубер.

Акрамя шэрагу беларускіх арганізацый, якія не пажадалі быць публічна названымі па меркаваннях бяспекі, у склад Кансультатыўнай рады ўваходзяць наступныя арганізацыі: Еўрапейскі цэнтр па канстытуцыйных правах і правах чалавека (E▯▯HR), Міжнародная федэрацыя па правах чалавека (F▯DH), Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў (▯R▯▯), Нарвежскі Хельсінкскі камітэт (NH▯), міжнародная арганізацыя

"Лекары за правы чалавека" (PHR), міжнародная арганізацыя "Рэпарцёры без межаў" (RSF) і Сусветная арганізацыя супраць катаванняў (ОМ[illegible]).

У працы па кіраванні дадзенымі Платформа працягвае супрацоўнічаць з вядучымі экспертамі ў галіне лічбавых расследаванняў. Адна з вядучых экспертных арганізацый забяспечвае пастаяннае абслугоўванне платформы для захоўвання доказаў, сабраных з закрытых крыніц -- максімальна абароненага асяроддзя для размяшчэння доказаў, сабраных нашымі партнёрамі. Працоўнае асяроддзе абсталявана функцыямі пашыранага пошуку, аналітыкі і карыстальніцкіх аб'ектаў, што дазваляе хутка выяўляць і класіфікаваць крытычна важную інфармацыю. Яна падтрымлівае двухмоўныя (ангельска-рускія) наборы дадзеных і кастамізаваныя прасторы для іх аналізу, што дазваляе выкарыстоўваць яе для сумесных расследаванняў у розных юрысдыкцыях.

Акрамя таго, Платформа абапіраецца на існуючы вопыт у правядзенні расследаванняў з выкарыстаннем адкрытых крыніц і падтрымцы праваабаронцаў у дакументаванні сур'ёзных парушэнняў міжнароднага права. Гэтая арганізацыя працягвае размяшчаць і аптымізаваць аналітычныя функцыі сховішча доказаў з адкрытых крыніц, якое налічвае больш за 1,2 мільёна файлаў.

Абодва тэхнічныя партнёры працуюць з Платформай над стратэгіямі бяспечнага захоўвання дадзеных, каб забяспечыць доўгатэрміновы доступ да найважнейшых доказаў для міжнародных органаў па забеспячэнні адказнасці, адначасова клапоцячыся пра тое, каб гэтыя дадзеныя апрацоўваліся ў адпаведнасці з міжнароднымі прававымі стандартамі.

## h. Фінансаванне

Трэцяя фаза Платформы падтрымліваецца Германіяй, Даніяй, Злучаным Каралеўствам, Злучанымі Штатамі Амерыкі, Ісландыяй, Латвіяй, Літвой, Нарвегіяй, Польшчай, Фінляндыяй, Швецыяй, Эстоніяй і Еўрапейскім Саюзам.

Фінансаванне першага года Фазы [illegible] было забяспечана дзякуючы шчодрым унёскам дзяржаў, у той час як для другога і трэцяга гадоў рэалізацыі трэцяй фазы праекта Платформа ўсё яшчэ займаецца зборам сродкаў, дапрацоўкай пагадненняў і зваротам да патэнцыйных донараў.

## i. Актуальныя цяжкасці

Адна з галоўных праблем у рэалізацыі праекта -- абставіны і ціск, у якіх беларускія арганізацыі-сузаснавальнікі вымушаны весці сваю працу. У першую чаргу гэта тычыцца цяжкасцяў са здабываннем доказаў з Беларусі.

З-за абвастрэння рэпрэсіўнай абстаноўкі ў Беларусі пацярпелыя і іншыя сведкі ўсё больш неахвотна згаджаюцца дзяліцца інфармацыяй і доказамі з органамі па прыцягненні да адказнасці. У адпаведнасці з патрабаваннямі GDPR, Платформа збірае і перадае інфармацыю і сведчанні толькі з відавочнай згоды асоб, якія падалі іх, і сістэматычна імкнецца абнаўляць першапачаткова атрыманыя формы згоды.

Нягледзячы на тое, што пастаяннае паступленне запытаў у Платформу відавочна сведчыць аб зацікаўленасці органаў крымінальнага правасуддзя ў расследаванні і судовым пераследзе меркаваных міжнародных злачынстваў, некаторыя юрысдыкцыі, якія маюць доступ да сведак і адпаведную прававую базу, па-ранейшаму не рашаюцца пачаць афіцыйнае расследаванне. Цяпер сведкі, апытаныя Платформай, знаходзяцца ў 35 краінах свету.

Адной з агульных праблем пры падрыхтоўцы аналітычных матэрыялаў для органаў крымінальнага правасуддзя з'яўляецца шырокая праблематыка запытаў, якая ў некаторых выпадках ахоплівае ўсе сабраныя матэрыялы. Для таго каб забяспечыць падтрымку, накіраваную на задавальненне канкрэтных патрэбаў і магчымасцяў следства, Платформа распрацавала рэкамендацыі па складанні запытаў аб дапамозе і працягвае працаваць з органамі крымінальнага правасуддзя над удакладненнем гэтых запытаў.

Нарэшце, праблемай з'яўляецца недастатковая ўвага міжнароднай супольнасці да парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі ў святле іншых крызісных сітуацый, у прыватнасці, вайны ва Украіне і сектары Газа.

Накіраванне Літвой справы аб сітуацыі ў Беларусі ў Міжнародны крымінальны суд надае важнае значэнне таму, што адбываецца ў краіне. Аднак гэтая справа, калі яна будзе прынятая да разгляду, будзе ахопліваць толькі частку злачынстваў, здзейсненых у Беларусі.

## j. Планаванне на будучыню

Платформа працягне збіраць і аналізаваць паказанні сведак, доказы і дадзеныя з адкрытых крыніц для падрыхтоўкі свайго бягучага дакладу, які змяшчае фактычны і прававы аналіз сітуацыі ў Беларусі з мая 2020 года, і працягне аказваць падтрымку органам крымінальнага правасуддзя і дзяліцца наяўнай інфармацыяй і доказамі, а таксама аналітычнымі прадуктамі ў адказ на іх запыты.

Следам за перадачай Літвой сітуацыі ў Беларусі ў МКС, Платформа накіруе прадстаўленне ў офіс Пракурора МКС у рамках папярэдняга разгляду, а таксама прапануе падтрымку іншым дзяржавам, якія жадаюць разгледзець пытанне аб далучэнні да Літвы ў дачыненні да перадачы справы аб злачынстве дэпартацыі.

Акрамя таго, Платформа працягне падтрымліваць працу Групы незалежных экспертаў ААН па Беларусі, спрыяючы правядзенню расследаванняў з дапамогай сабраных Платформай доказаў і інфармацыі, з мэтай падмацавання высноў у маючым адбыцца дакладзе ГНЭБ.

Мы будзем уважліва сачыць за развіццём падзей у святле будучых выбараў у Беларусі ў студзені 2025 года. Сярод стратэгічных планаў на бліжэйшы час -- абмеркаванне і ўзмацненне работы па забеспячэнні ўстойлівасці дзейнасці доказнай базы Платформы, а таксама магчымыя мэты чацвёртай фазы ў выпадку яе фінансавання.

## *Падзяка*

Карыстаючыся магчымасцю, Платформа дзякуе сваім шчодрым донарам, арганізацыям, якія падтрымліваюць Платформу праз Кансультатыўны савет, усім іншым партнёрам і ўдзельнікам, а таксама сваім высокакваліфікаваным супрацоўнікам і кансультантам.

# ЗАЎВАГІ

[1] Працягвалася злоўжыванне заканадаўствам аб супрацьдзеянні экстрэмізму і тэрарызму для пераследу тых, хто выказвае нязгоду з палітыкай уладаў. У перыяд з красавіка па верасень 2024 года ў "Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці" было ўнесена не менш за 409 чалавек за ўдзел у вулічных акцыях пратэсту ці іншых формах праявы меркаванага іншадумства. *Гл.* "Абнаўленне "Спісу экстрэмістаў" і ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 6-9 верасня", *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 9 верасня 2024 года.
[2] "Палітычныя зняволеныя ў Беларусі", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, без даты.
[3] У ліпені 2024 года Рабочая група ААН па адвольных затрыманнях прызнала зняволенне Алеся Бяляцкага парушэннем міжнароднага права і запатрабавала яго неадкладнага і безумоўнага вызвалення. *Гл.* UN WGAD, Opinion No. 3/2024 concerning Aleksandr Bialiatski (Belarus), A/HRC/WGAD/2024/3, 16 мая 2024 г.
[4] "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[5] "IFJ і EFJ патрабуюць вызвалення зняволеных журналістаў у чацвёртую гадавіну фальсіфікацыі выбараў", *Беларуская асацыяцыя журналістаў*, 9 жніўня 2024 года.
[6] У ліпені было памілавана 18 зняволеных, яшчэ 30 чалавек -- указам ад 16 жніўня, яшчэ 30 -– указам ад 4 верасня і 37 –- указам ад 16 верасня. *См.* "Лукашэнка памілаваў 30 чалавек, асуджаных за злачынствы, звязаныя з пратэстамі", *Белта*, 16 жніўня 2024 года; "Лукашэнка памілаваў яшчэ 37 зняволеных", *DW*, 16 верасня 2024 года; ""Не сведчыць пра сур'ёзныя змены ў сітуацыі з правамі чалавека". Праваабаронца "Вясны" каментуе вызваленне палітвязняў", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 ліпеня 2024 года.
[7] "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[8] "Gone but not forgotten: Political prisoners are being disappeared", *The Washington Post*, 5 ліпеня 2024 г.; "500 дней в режиме неизвестности. Что с Марией Колесниковой?", *DW*, 29 чэрвеня 2024 г.; Сумесная рэзалюцыя аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных у Беларусі, *Еўрапейскі парламент*, RC-B10-0026/2024, 18 верасня 2024 г.
[9] "Камітэт ААН па ліквідацыі дыскрымінацыі жанчын заклікаў Беларусь прыняць тэрміновыя меры для абароны Паліны Шарэнда-Панасюк", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 21 сакавіка 2023 г.; "Gone but not forgotten: Political prisoners are being disappeared", *The Washington Post*, 5 ліпеня 2024 г.
[10] "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[11] "У палітзняволенай Паліны Шарэнды-Панасюк рэзка пагоршыўся стан здароўя", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 4 верасня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[12] "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[13] "Беларускія палітвязні ў турмах строгага рэжыму: ціск узмацняецца", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 31 ліпеня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[14] "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024", *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 5 верасня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2024", Праваабарончы цэнтр "Вясна", 8 жніўня 2024 г.

[15] “Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[16] “Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 г.;"Адміністрацыйны пераслед па артыкуле 24.15 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, без даты.
[17] “Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 года.
[18] 9 чалавек у красавіку, 17 ў траўні, 1 ў чэрвені, 4 ў ліпені, і 7 ў жніўні. *Гл.* “Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2024”, *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 8 мая 2024 года; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Май 2024", *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 6 чэрвеня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Чэрвень 2024", *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 9 ліпеня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Ліпень 2024”, *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 8 жніўня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024”, *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 5 верасня 2024 года.
[19] “Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Жнівень 2024”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 5 верасня 2024 г.; "Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2024”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 8 мая 2024 г.
[20] “Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі прызналі экстрэмісцкім фармаваннем”, *"Наша Ніва"*, 7 кастрычніка 2024 г.
[21] З лютага па ліпень 2024 года ў спіс было ўнесена 46 чалавек, яшчэ 3 чалавекі былі дададзеныя ў ліпені, 9 чалавек - у жніўні і 12 чалавек - у верасні. *Гл.* ”Папаўненні ў "спісе тэрарыстаў", ліквідацыя грамадскіх аб'яднанняў: хроніка пераследу 11 ліпеня", *Праваабарончы цэнтр* "Вясна", 11 ліпеня 2024 г.; "Затрыманне пасля гутаркі ў чат-рулетцы, канфіскацыя кватэры журналіста: хроніка пераследу 12 ліпеня", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 12 ліпеня 2024 г.; “Абнаўленне "тэрарыстычнага спісу" і новыя затрыманні ў Фаніпалі: хроніка пераследу 8 жніўня", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 8 жніўня 2024 г.;"Затрыманне актывіста "Руху За Свабоду" і папаўненне ў "экстрэмісцкім" і "тэрарыстычным" спісах: хроніка пераследу 4-5 верасня", *Праваабарончы цэнтр "Вясна",* 5 верасня 2024 года.
[22] “Спіс палітвязняў і асуджаных па крымінальных справах", *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, без даты.
[23] Тэлеграм-канал @viasna96, апублікавана 10:01, 27 мая 2024 г., https://t.me/viasna96/26101.
[24] “Праваабаронца Леанід Судаленка завочна асуджаны за садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці”, *Праваабарончы цэнтр* "Вясна" , 12 чэрвеня 2024 г. Раней Леанід Судаленка быў асуджаны паводле артыкула 342 ("групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак") Крымінальнага кодэкса.
[25] “Журналіст і праваабаронца Уладзімір Хільмановіч асуджаны завочна”, *Праваабарончы цэнтр "Вясна"*, 21 жніўня 2024 г.
[26] “Лукашэнка памілаваў асуджанага да смяротнага пакарання немца Рыка Крыгера", *"Вясна-Скажы НЕ смяротнаму пакаранню"*, 31 ліпеня 2024 г.
[27] “Лукашэнка памілаваў асуджанага да смяротнага пакарання немца Рыка Крыгера", *"Вясна-Скажы НЕ смяротнаму пакаранню"*, 31 ліпеня 2024 г.
[28] “German far-right MP Jörg Dornau reportedly used Belarusian political prisoners as forced labor on his onion plantations”, *The Insider*, 24 верасня 2024 г.; “Lukashenko’s prisoners used as cheap labor by far-right German onion tycoon”, *Politico*, 24 верасня 2024 г.
[29] “Three Belarusian nationals charged for forcing Polish plane to land to arrest dissident”, *Eurojust*, 6 верасня 2024 г.
[30] *Гл.* КПІ ААН, Заключныя заўвагі па першапачатковым дакладзе Беларусі, CRPD/C/BLR/CO/1, 26 верасня 2024; КСК ААН, Даклад камітэта супраць катаванняў, A/79/44, 21 чэрвеня 2024;

КЛРД ААН, Заключныя заўвагі па аб'яднаным дваццаць чацвёртым-дваццаць пятым перыядычным дакладах Беларусі, CERD/C/BLR/CO/24-25, 16 верасня 2024 г.

[31] КСК ААН, Даклад камітэта супраць катаванняў, A/79/44, 21 чэрвеня 2024, п.46.

[32] КЛРД ААН, Заключныя заўвагі па аб'яднаным дваццаць чацвёртым-дваццаць пятым перыядычным дакладах Беларусі, CERD/C/BLR/CO/24-25, 16 верасня 2024, п.29.

[33] Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента ад 19 верасня 2024 года аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных у Беларусі, 2024/2804 (RSP), 19 верасня 2024 г.

[34] *Гл.* "Serbian appeals court overturns ruling to extradite to Belarus a critic of its authoritarian regime", *AP*, 11 верасня 2024 г.

[35] Рэзалюцыя Еўрапейскага парламента ад 19 верасня 2024 года аб цяжкім становішчы палітычных зняволеных у Беларусі, 2024/2804 (RSP), 19 верасня 2024 г.

[36] 2024-09-30-state-party-referral-lithuania.pdf (icc-cpi.int)

[37] Заява Пракурора Міжнароднага крымінальнага суда Карыма А. А. Хана аб атрыманні звароту ад Літоўскай Рэспублікі / Міжнародны крымінальны суд(icc-cpi.int)

[38] Заява: Платформа IAPB вітае накіраванне Літвой справы аб злачынствах супраць чалавечнасці, здзейсненых беларускімі службовымі асобамі, у МКС https://iapbelarus.org/press-statements/

[39] Група незалежных экспертаў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі / УВКПЧ, заснаваная Саветам па правах чалавека ў адпаведнасці з рэзалюцыяй A/HRC/RES/55/27 ад 4 красавіка 2024 г.

[40] Сярод сінэргій – кансультацыі і трэнінг па даказванні датычнасці.

[41] У прыватнасці, з дапамогай трох мэтаў і чатырох стратэгічных задач (СЗ) (выкладзеных у частцы 3) Гэты праект накіраваны на дасягненне наступных вынікаў: перспектывы правасуддзя і прыцягнення да адказнасці за сур'ёзныя міжнародныя злачынствы і грубыя парушэнні правоў чалавека, здзейсненыя беларускімі ўладамі, пашыраюцца дзякуючы падрыхтоўцы і перадачы спраў у органы крымінальнага правасуддзя, якія расследуюць і пераследуюць іх у адпаведнасці з самымі высокімі міжнароднымі стандартамі (SO1 SO2 SO3). Прымяняецца падыход, арыентаваны на пацярпелых. Адпаведна, беларускія пацярпелыя, сведкі і праваабаронцы, якія падвергліся катаванням ці іншым траўмам, усё часцей атрымліваюць эфектыўную медыцынскую, псіхасацыяльную і прававую дапамогу, і да іх прымяняецца падыход, які ўлічвае траўмы, што дазваляе ім лягчэй прадастаўляць інфармацыю і доказы для мэт прыцягнення да адказнасці і пакрыцця шкоды (SO4).

[42] https://freedomlab.io/courses/trauma-informed-interviewing-skills-and-techniques-for-monitors/